**Спіс крыніц**

1. *Вітка, В.* Слова – не верабей // Полымя. — 1987. — № 3. — С. 207 — 216.
2. *Каўрус, А. А.* Культура слова / А. А. Каўрус — Мінск : Нар. асвета, 1983. — 78 с.
3. *Янкоўскі, Ф. М.* Беларуская мова / Ф. М. Янкоўскі — Мінск : Выш. школа, 1978. — 336 с.



***М. М. Шуляк***

*Навуковы кіраўнік — В. М. Шавель*

Баранавіцкі дзяржаўны універсітэт,

г. Баранавічы, Рэспубліка Беларусь


## КАМП'ЮТЭРНАЕ ТЭСЦІРАВАННЕ ЯК ФОРМА КАНТРОЛЮ ЗА ЎЗРОЎНЕМ ПАДРЫХТАВАНАСЦІ ВУЧНЯЎ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

Агульнавядомымі інфармацыйнымі тэхналогіямі, якія выкарыстоўваюцца ў працэсе навучання, з'яўляюцца мультымедыйныя тэхналогіі (электронныя падручнікі, навучальныя праграмы, тэсціраванне, правядзенне лабараторных работ і экскурсій, прэзентацыі); Інтэрнэт – тэхналогіі (віртуальныя падручнікі, энцыклапедыі, даведнікі, трэнажоры; тэлевізійныя тэхналогіі (чытанне лекцый, дэманстрацыя лабараторных і практычных работ у прамым эфіры)); кейс – тэхналогія (навучанне па распрацаваных у дадзенай вучэбнай установе дапаможніках, тэстах, кантрольных работах).

У сувязі са зменамі ў кантрольна-ацэначнай сістэме на сучасным этапе значна актуалізавалася праблема пошуку эфектыўных тэхналогій і форм ацэньвання якасці адукацыі. Педагагічны вопыт пацвярджае дастатковую эфектыўнасць такой тэхналогіі ацэнкі вучэбных дасягненняў як тэсціраванне. На думку М. А. Юрачкіна, «у цяперашні час яно (тэсціраванне) з'яўляецца найбольш аптымальнай вымяральнай педагагічнай працэдурай, якая адказвае не толькі «знешнім» патрабаванням . . , але і надзейнасці методык яе рэалізацыі» [2, с. 22].

Пастаянная практыка і ўкараненне тэставага кантролю, яго аўтаматызацыя і камп'ютэрызацыя ствараюць шырокія магчымасці для навуковых дасягненняў.

Камп'ютэр з'яўляецца магутным сродкам для апрацоўкі інфармацыі, можа быць выкарыстаны як сродак навучання, які ўдасканальвае вучэбны працэс, павышае яго эфектыўнасць і якасць, дазваляе рэгістраваць, назапашваць, захоўваць, апрацоўваць інфармацыю аб вывучаемых аб'ектах, працэсах, перадаваць вялікія аб'ёмы інфармацыі; з'яўляецца сродкам аўтаматызацыі працэсаў кантролю, ацэнкі ўзроўню ведаў навучэнцаў, камп'ютэрнага педагагічнага тэсціравання [1].

Выкарыстанне камп'ютэрнага тэсціравання на розных этапах урока (на этапе праверкі дамашняга задання, праверкі першаснага ўспрымання зместу правіла, замацавання вывучанай тэмы, абагульнення) дае магчымасць праверыць веды, уменні, навыкі вучняў хутка і аб'ектыўна, актывізаваць іх пазнавальную дзейнасць: у пазаўрочны час большасць вучняў выяўляе жаданне працягваць работу з тэставымі заданнямі ў камп'ютарным класе.

Для арганізацыі камп'ютарнага тэсціравання намі на практыцы была апрабавана праграма Tester, якая не патрабуе глыбокіх ведаў школьнікаў у галіне інфарматыкі, дае магчымасць самастойна працаваць з ёй, прапануючы карыстальнікам даступны алгарытм дзеянняў.

Праграма дазваляе стварыць набор тэставых пытанняў з вызначэннем — «вартасці» — кожнага пытання (1, 2, 3, 4. . . . 10). Пытанні могуць быць з некалькімі варыянтамі адказаў (не болей за 6), з адным правільным варыянтам, з выбарам правільна / няправільна, з кароткім адказам (два словы), з лікавым адказам, на адпаведнасць, на ўстанаўленне правільнай паслядоўнасці (не болей 6). Пры выкананні тэста праграма Tester паказвае правільныя адказы і адзнакі ў адпаведнасці з дзесяцібальнай сістэмай ацэнкі ведаў, уменняў і навыкаў, дазваляе прааналізаваць усе няправільныя адказы. Выкананне тэста камп'ютэрнай праграмай можа быць абмежавана ў часе: у залежнасці ад складанасці тэставых заданняў, іх колькасці, узроўню падрыхтаванасці класа і асобна ўзятага вучня.

Для аб'ектыўнай ацэнкі вартасцей камп'ютэрнага тэсціравання сярод настаўнікаў-практыкаў намі было праведзена анкетаванне.

Настаўнікі, якія назіралі ці выкарыстоўвалі камп'ютэрнае тэсціраванне на сваіх уроках, у анкетах адзначылі наступныя вартасці такога віду кантролю:

- адсутнасць прывязанасці да часу паміж настаўнікам і вучнем (у большасці выпадкаў);
- аўтаматызаваны кантроль (самакантроль) вынікаў вучэбнай дзейнасці;
- аб'ектыўная ацэнка ведаў;
- строга індывідуальная работа вучняў у час выканання заданняў;
- архіўнае захаванне дастаткова вялікіх аб'ёмаў інфармацыі з магчымасцю яе перадачы, а таксама лёгкага доступу і звароту карыстальніка да цэнтральнага банка дадзеных.

Разам з тым настаўнікі адзначаюць наступныя моманты работы з персанальным камп'ютарам, якія можна ўспрымаць як адмоўныя:

– недахоп неабходнага камфорту пры рабоце з персанальным камп'ютэрам: прывязанасць да месца, памераў экрана;

– адмоўны ўплыў на «ўзаемаадносіны» чалавека з камп'ютэрам фактару тэхніцызму.

Практыка выкарыстання камп'ютэрных тэхналогій пераконвае ў тым, што арганізацыя тэставага кантролю садзейнічае індывідуалізацыі і інтэнсіфікацыі, з'яўляецца неабходнай умовай мадэрнізацыі сістэмы адукацыі.

Сучаснае камп'ютэрнае навучанне ўключае вучня ў сістэму інфармацыйных баз дадзеных, здымае прасторава-часавыя абмежаванні пры рабоце з крыніцамі інфармацыі і вызначае новы тэмп і рытм авалодвання ведамі.

Метадычная мэтазгоднасць прымянення сучасных камп'ютэрных тэхналогій у вучэбным працэсе вызначаецца шырокімі магчымасцямі працы з інфармацыйнымі крыніцамі як ва ўмовах школы, так і пры самастойнай працы ўсіх удзельнікаў адукацыйнага працэсу. Таксама яны даюць новыя накірункі для творчасці, набыцця і замацавання разнастайных навыкаў, дазваляюць рэалізоўваць новыя формы і метады кантролю на аснове выкарыстоўваемых інфармацыйных сродкаў.

**Спіс крыніц**

1. *Клейман, Т. М.* Школы будующего: Компьютеры в процессе обучения / Т. М. Клейман. — М. : Радио и связь, 2005. — 250 с.
2. *Юрочкин, А. М.* Централизованное тестирование / М. А. Юрочкин // Народная асвета. – 2002. — № 10. — С. 21 — 26.

***Т. П. Шэўчык***
*Навуковы кіраўнік — І. Я. Лепешаў*
Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Я. Купалы,
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

## СУЧАСНЫЯ ПАДЫХОДЫ ДА ТЫПАЛОГІІ ФРАЗЕАЛАГІЧНЫХ СІНОНІМАЎ

Вывучэннем сістэмных адносін на ўсіх моўных узроўнях у апошні час займаюцца многія лінгвісты. Яно дазваляе зразумець будову моўнай сістэмы і механізмы яе функцыянавання. На сучасным этапе фразеалогія ўсё часцей даследуецца асобна ад лексікі, хаця і ў цеснай сувязі з ёю. Дадзеная праца прысвечана аналізу аднаго з аспектаў сістэмных адносін ў фразеалогіі, у прыватнасці — тыпалогіі фразеалагічных сінонімаў. У даследаванні былі выкарыстаны наступныя метады: апісальны, метад кампанентнага аналізу фразеалагічнага значэння, метад аналізу слоўнікавай дэфініцыі, дыстрыбуцыйны аналіз і іншыя.

Традыцыйна прынята вылучаць наступныя класы сінонімаў: абсалютныя, ідыяграфічныя, стылістычныя і стылістыка-ідыяграфічныя. Часам выдзяляюць яшчэ адзін тып сінонімаў — кантэкстуальныя. Да іх адносяць адзінкі, што праяўляюць сінанімічныя сувязі толькі ў пэўным кантэксце. Паводле большасці фармальных крытэрыяў (такіх, як блізкасць значэнняў, аднесенасць да адной часціны мовы, аднолькавая ці падобная спалучальнасць) дадзеныя адзінкі можна было б лічыць сінанімічнымі, але адсутнасць сістэматычнай узаемазамяняльнасці дазваляе адносіць такія выпадкі семантычных збліжэнняў да перыферыі сінаніміі.

Дадзеная класіфікацыя прымяняецца шматлікімі даследчыкамі, але некаторыя мовазнаўцы небеспадстаўна крытыкуюць яе. Відавочна, што ў традыцыйнай класіфікацыі змешваюцца два аспекты: фукнцыянальна-маўленчы і семантычны. Т. Б. Бараннікава лічыць, што поўную і аб'ектыную класіфікацыю сінонімаў нельга правесці з улікам толькі аднаго аспекта. Даследчыца вылучае дзве асноўныя групы сінонімаў: экстралінгвістычныя і лінгвістычныя сінанімічныя адзінкі, а апошнюю групу падзяляе на два класы сінонімаў (стылістычныя і нестылістычныя). Кожны клас у сваю чаргу падраздзяляецца на шэраг падкласаў. Пазітыўным бокам прапанаванай класіфікацыі яе аўтар лічыць сістэмны, паслядоўны і іерархічны характар групоўкі адзінак і адсутнасць наслаенняў паміж выдзеленымі класамі [2, с. 58]. Вынікі яе класіфікацыі можна перадаць пры дапамозе наступнай табліцы:

| Экстралінгвістычныя сінонімы | | Лінгвістычныя сінонімы | | |
|---|---|---|---|---|
| Эмацыянальна-ацэначныя | Эмацыянальна-нейтральныя | Стылістычныя | | Нестылістычныя |
| | | Эмацыянальна-ацэначныя | Эмацыянальна-нейтральныя | |

Выдзяленне сярод лінгвістычных сінонімаў стылістычных і нестылістычных адпавядае таксама класіфікацыі сінанімічных адзінак, прапанаванай У. У. Вінаградавым, які падзяляў іх на семантычныя і стылістычныя [3, с. 69]. Гэтую класіфікацыю дэталёва прааналізаваў М. І. Задарожны і прыйшоў да высновы, што існуе таксама яшчэ адзін тып сінанімічных адзінак (Т. Б. Бараннікава называе іх экстралінгвістычнымі). Ён сустрэў выпадкі, «калі сінонімы, што адрозніваюцца эмацыянальна-экспрэсіўна, характарызуюцца адной і той жа функцыянальна-стылёвай аднесенасцю, і, наадварот, сінонімы розных сфер ужывання валодаюць тоесным эмацыянальна-экспрэсіўным статусам» [5, с. 68. ]. Кардынальна новай у даследаванні М. І. Задарожнага з'яўляецца прапанова далейшага паглыблення класіфікацыі сінонімаў па шляху размежавання эмацыянальна-ацэначнай і экспрэсіўнай, а пасля і эмацыянальнай і ацэначнай характарыстык [5, с. 73]. Таму можна зрабіць